**ЭКСКУРСІЙНЫ МАРШРУТ**




**«Па Купалаўскіх мясцінах»**

***Аўтары:*** *Савет музея баявой славы “Подзвіг” Маладзечанскай сярэдняй школы №1 імя Янкі Купалы.*

***Кіраўнікі:*** *Смалонская Вольга Аляксандраўна, дырэктар музея баявой славы “Подзвіг” Маладзечанскай сярэдняй школы №1 імя Янкі Купалы.*

**Мэта экскурсіі:** фарміраванне цікавасці да чытання праз прыцягненне ўвагі да жыцця і творчасці яркага прадстаўніка айчыннай літаратуры Янкі Купалы.

**Задачы экскурсіі:**

абудзіць цікавасць да жыцця і творчасці Я.Купалы;

пазнаёміць удзельнікаў экскурсіі з месцамі жыцця і творчасці Я.Купалы;

фарміраваць мастацкі густ;

выхоўваць павагу да роднай мовы.

**Від экскурсіі:** комплексная аўтобусная.

**Працяг:** 520 хвілін (1 дзень, у тым ліку 4 экскурсійныя гадзіны, плюс 4 гадзіны суправаджэння) альбо 360 хвілін (1 дзень, у тым ліку 3 экскурсійныя гадзіны, плюс 3 гадзіны суправаджэння)

**Працягласць маршрута**: 180 км альбо 220 км.

**Змест:** экскурсія знаёміць з жыццём і творчасцю Янкі Купалы - класіка беларускай літаратуры.

Экскурсанты, наведаўшы месцы нараджэння і жыцця Янкі Купалы, змогуць пранікнуцца атмасферай, якая натхняла Купалу на напісанне твораў, што сталі класікай беларускай літаратуры. Таксама падчас падарожжа экскурсанты атрымаюць інфармацыю аб гісторыі населеных пунктаў, у якіх робяцца прыпынкі.

**Маршрут экскурсіі:** г. Маладзечна – в. Яхімоўшчына – в. Вязынка – в. Харужанцы – г. Маладзечна альбо г. Маладзечна – в. Яхімоўшчына – в. Вязынка – в. Харужанцы – г. Мінск – г.п. Радашковічы - г. Маладзечна.

**Уступ да экскурсіі:** уступ да экскурсіі даваць пасля пасадкі групы ў аўтобус да пачатку руху – 2-3 хвіліны. У арганізацыйнай частцы пасля знаёмства з групай назваць сваё прозвішча і імя; вырашыць неабходныя арганізацыйныя пытанні; нагадаць аб правілах бяспечных паводзін у аўтобусе.

У інфармацыйнай частцы даць кароткае паведамленне аб тэме экскурсіі, згадаць 2-3 найбольш цікавыя аб'екты, не даючы ім падрабязнай характарыстыкі; назваць месца пачатку экскурсіі.

**ТЭХНАЛАГІЧНАЯ КАРТА МАРШРУТА ЭКСКУРСІІ**

**«Па Купалаўскіх мясцінах»**

| **Маршрут экскурсіі** | **Месцы прыпынкаў** | **Аб'екты паказу** | **Час / хвіл.** | **Асноўны змест экскурсіі. Пералік падтэмаў і пытанняў** | **Арганізацыйныя ўказанні** | **Метадычныя ўказанні** |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Пачатак экскурсіі | - | - | 5 | Уводзіны да тэмы экскурсіі | Інфармацыйны ўступ | Уводзіны да тэмы. Усталяваць эмацыйна-псіхалагічны кантакт з групай, наладзіць яе на ўспрыняцце экскурсіі. Уступ да экскурсіі зрабіць яркім і вобразным, дадаткова можна выкарыстаць верш Янкі Купалы. Падчас шляху да першага прыпынку ўспомніць з экскурсантамі лёс і творчасць беларускага паэта, драматурга, публіцыста, перакладчыка, класіка беларускай літаратуры, аднаго з заснавальнікаў новай беларускай літаратуры і літаратурнай мовы Я. Купалы |
| В. Яхімоўшчына, Маладзечанскі раён, Мінская вобласць | Прыпынак | Будынак былой канторы бровара, мемарыяльная дошка, экспазіцыйныя залы музея, пакой-кабінет, дзе жыў Я.Купала | 60 | Паходжанне назвы вёскі, гісторыя і адметнасць філіяла, агляд экспазіцыі з тлумачэннямі, наведванне падвала | На прыпынку экскурсавод выводзіць групу з аўтобуса, нагадваючы пра правілы дарожнага руху, падводзіць да музея. Згадаць пра ацярожнасць пры спуску і падняцці па лесвіцы ў падвал | Пры пад’ездзе да хутара звярнуць увагу на прыгажосць роднай прыроды. Даць інфармацыю пра тое, што час для фатаграфавання і набыцця сувенірнай прадукцыі будзе дадзены пасля асноўнага экскурсійнага часу |
| В. Вязынка-в. Харужанцы | Пераезд | Прыгажосць прыроды | 30 | Даць магчымасць адпачыць падчас руху. Пры | Расказ вядзецца падчас руху | Даць даведку аб Лагойскім раёне (яго тэрыторыі, прыродзе, культуры і гісторыі). Варыянт лагічнага |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | правядзенні экскурсіі для вучняў I-II ступені навучання даць магчымасць падсілкавацца | | пераходу: *« Лагойшчына — радзіма вядомых беларускіх пісьменнікаў і паэтаў: Змітрака Бядулі, Ядзвігіна Ш. (А.Лявіцкі), Леапольда Радзевіча, Ніла Гілевіча, Івана Пташнікава і інш. На лагойскай зямлі вырас і сфарміраваўся як вялікі нацыянальны паэт не толькі беларускай зямлі, але і ўсяго славянскага свету — Янка Купала.”* |
| в. Харужанцы | Філіял “Акопы” | Будынак і экспазіцыя музея | 60 | Адзначыць, што тут Купала нарадзіўся як лірык сусветнага значэння і выдатны драматург, гісторыя філіяла, агляд экспазіцыі | Напомніць аб правілах бяспечных паводзін | Падкрэсліць адметнасць філіяла праз наяўнасць тэатральнай залы. Устанавіць сувязь з творчасцю Янкі Купалы. Даць інфармацыю пра працяг тэмы у далейшай часцы эксурсійнага часу, тым самым зацікавіць экскурсантаў. Пазнаёміць з невялікім гаем, летнім амфітэатрам |
| В. Харужанцы- г.п. Радашковічы.- г. Мінск | Пераезд. Прыпынак.<br><br>Вяртанне ў г.Маладзечна | Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы | 40(180) | Першы паказ п’есы “Паўлінка”, гіторыя тэатра імя Я.Купалы | Расказ вядзецца падчас руху.<br><br>На прыпынках згадаць пра правілы паводзінаў | Лагічны пераход: *«Іменем паэта названы Нацыянальны акадэмічны тэатр у г. Мінску »*<br><br>Варыянт лагічнага пераходу: *«У Радашковічах пакінулі сляды знакамітыя людзі: Максім Танк, Язэп Драздовіч, Браніслаў Тарашкевіч… Нельга тут не сказаць і пра Янку Купалу…».*<br><br>Пры магчымасці, альбо у павялічанай версіі экскурсіі можа быць прапанавана наведванне Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, дзе ў пастаянным рэпертуары можна паглядзець п'есу “Купалінка. |

**Прыпынак 1. В. Яхімоўшчына**

У вёсцы Яхімоўшчына Маладзечанскага раёна размешчаны самы "малады" філіял Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы.

Вёска Яхімоўшчына (а вядомая яна з XVI стагоддзя) мае багатую гісторыю. Назву сваю яна атрымала ад прозвішча першых уладальнікаў — Яхімовічаў. Сядзіба ў Яхімоўшчыне была створана ў сярэдзіне XIX стагоддзя Ёсіфам Сулістроўскім, маршалкам Аршанскага павета. У 1877 годзе яе атрымаў у валоданне пан Ян Любанскі. Маёнтак займаў 40 гектараў, на яго тэрыторыі размясціліся млын, маслабойня, цагельня, смалярня, паравы бровар на бульбяной сыравіне.

Усё гэта застаў Янка Купала, але нажаль ўжо ніколі не зможам убачыць мы. У тым ліку і сядзібу Любанскіх, аб былой велічы якой цяпер нагадваюць хіба што складзеныя з камянёў падмуркі бровара, свірнаў, рэшткі пейзажнага парку англійскага тыпу, сажалкі.

У 1906-1907 гг. малады паэт працаваў памочнікам вінакура на бровары ў Яхімоўшчыне [3]. І менавіта тут у Яхімоўшчыне адбывалася грамадскае сталенне народнага паэта, узрастаў і мужнеў яго талент, з'явіліся выдатныя вершы, сярод якіх "А хто там ідзе?", "Гэта крык, што жыве Беларусь…", "Не дайце згінуць песняру", "Ворагам Беларушчыны", "Дуб", "Воля", "З песень нядолі", "Дайце мне волю" і інш., што склалі першы паэтычны зборнік Янкі Купалы "Жалейка".

Старажытныя будынкі вёскі, парк, вадаёмы, валуны памятаюць Янку Купалу.

Філіял "Яхімоўшчына" адкрыты для наведвальнікаў у 2001 годзе.

Гэта адзінае "гняздо" пісьменніка, якое не разбурылі ні час, ні людзі. **Тут можна ўбачыць і рукапісны варыянт верша «Мужык», і нават дазволяць патрымацца за дзвярную ручку, якая памятае яго, Купалаў, дотык.**

Таму Уладзіслава Францаўна Луцэвіч, жонка паэта – стваральнік і першы дырэктар Дзяржаўнага літаратурна музея Янкі Купалы – так імкнулася ўшанаваць мемарыяльную мясціну. Стварыць дом-музей Янкі Купалы ў Яхімоўшчыне У.Ф. спрабавала яшчэ ў 1959 годзе. Яна прыязджала ў вёску, дамаўлялася, але справа так і не зрушылася з месца.

Дом, дзе жыў паэт, захаваўся ў нядрэнным стане. Доўгі час там знаходзіўся прытулак для састарэлых.

Супрацоўнікі музея прыбіралі пакоі, перасцілалі ў асобных памяшканнях падлогу, прыводзілі ў парадак падвал. Колісь, у Купалавым доме, там была кухня. Канешне, ад яе амаль нічога не засталося. Але ж супрацоўнікам так хацелася вадзіць сваіх наведвальнікаў «Сцяжынкай кухаркі»!

У 1959 годзе мемарыяльная дошка (дадатак 5) была ўсталявана на будынку колішняй канторы бровара пана Любанскага (дадатак 7, 6), а ў 1982 годзе дошка з'явілася і на будынку, у адным з пакояў якога жыў малады паэт і дзе зараз размяшчаецца экспазіцыя філіяла музея. Да рэвалюцыі тут быў дом для прыслугі і рабочых маёнтка [1]. Так сказаць працоўны інтэрнат. У вялікім падвале пад домам захоўвалася і гатавалася ежа для панскага дома.

Плошча экспазіцыі музея складае больш за 100 м² [3]. Інтэр'ер яго адноўлены па ўспамінах старажылаў. Шафа, засланы посцілкай драўляны ложак, стол з пісьмовымі прыладамі, камода, этажэрка з кнігамі. На ёй — невялікае люстэрка. Яно калісьці сапраўды служыла сям'і Луцэвічаў. Галоўная мэта экспазіцыі — паказаць нараджэнне нацыянальнага літаратурнага генія, аднавіць час, калі пачынаўся і распаўсюджваўся беларускі легальны друк, вызначыць яго ўплыў на тагачаснае беларускае грамадства, адлюстраваць значнасць першага паэтычнага зборніка Янкі Купалы «Жалейка».[4]

У двух пакоях філіяла музея размяшчаюцца экспазіцыйныя залы, а трэці пакой-кабінет, дзе жыў Я.Купала, — мемарыяльны. Тут усё захавалася ў тым выглядзе, як было ў пачатку 20 стагоддзя: пісьмовы стол, побач венскае крэсла, этажэрка з кнігамі, камод, дзе зберагаўся ўвесь скарб маладога чалавека. На стале — пісьмовыя прылады высакароднай працы, падсвечнік, гадзіннік павольна адмярае час [4], (дадатак 8,9). Многія экспанаты для будучага філіяла музея яхімоўшчынцам прывезлі са сталіцы. Асобныя яны адшукалі самі альбо прынялі ў дарунак ад мясцовых жыхароў. Гонар экспазіцыі — самавар, з якога піў гарбату сам Янка Купала. Належаў ён сям'і Шаўчэнка і дастаўся ім у спадчыну ад прадзеда, які працаваў у пана цесляром і сябраваў з будучым паэтам. З пакалення ў пакаленне перадавалі яны гэтую сямейную рэліквію. А калі адкрыўся музей — прынеслі сюды.

У экспазіцыі выкарыстаныя мастацкія творы Э. Агуновіча, М. Гусева, Я. Раманоўскага, К. Харашэвіча і В. Ціхановіча, у якіх адлюстравана праца паэта на бровары.[2]

Традыцыйна штогод на тэрыторыі Яхімоўшчыны ў дзень нараджэння паэта (7 ліпеня) праводзіцца Купальскае свята.

**Прынак 2. Вязынка**

Упершыню вёска згадваецца ў рукапісах 1528 года. Але дакладныя звесткі з'явілісь значна пазней. Вядома, што у 19 стагоддзі Вязынка спачатку належала сям'і памешчыка Пшаздзецкага, а затым - Замбржыцкім. У 1882 годзе ў адной з сядзіб вёскі нарадзіўся Янка Купала. Да 1909 годзе ў Вязынцы налічвалася ўсяго 4 двары, а насельніцтва складала 26 чалавек. У 1922 годзе, пасля савецка-польскай вайны населены пункт апынуўся на тэрыторыі Польшчы. 17 верасня 1939 года пасля аб'яднання Заходняй і Ўсходняй частак Беларусі Вязынка ўвайшла ў склад БССР.

У 2017 годзе ў вёсцы з размахам адзначылі 135-годдзе з дня нараджэння Купалы, яе самага вядомага ўраджэнца [2].

"Адплаціў народу

Чым моц мая магла:

Зваў з путаў на свабоду,

Зваў з цемры да святла”

Філіял “Вязынка” адкрыты для наведвальнікаў 20.06.1948. У 1972 г. створаны Купалаўскі мемарыяльны запаведнік “Вязынка” (агульная плошча 21 га) (дадатак 1).

Менавіта тут, у колішнім маёнтку Вязынка, нарадзіўся Ясь Луцэвіч, будучы народны паэт Беларусі Янка Купала (1882 – 1942) (дадатак 4).

Аблічча сядзібы сёння - гэта аблічча сядзібы XIX стагоддзя: тая ж архітэктура, тыя ж пейзажы, той жа сажалка. У навінку толькі дрэвы, пасаджаныя жонкай паэта і яго прыхільнікамі.

Мемарыяльная дошка на хаце ў Вязынцы, дзе нарадзіўся паэт, была адкрыта ў 1946-м, а праз два гады пачаў працаваць і музей. У 2012 г. да 130-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы праведзена мадэрнізацыя літаратурна-дакументальнай часткі экспазіцыі (мастак Г. Чысты), якая прысвечана нараджэнню чалавека і нараджэнню паэта і ахоплівае адпаведна перыяд з 1882 па 1904 г. – час станаўлення асобы Яна Луцэвіча.

З-за ўмоў захоўвання у музеі частка экспазіцыі састарэла. Час і кліматычныя ўмовы адмоўна сказаліся на стане экспанатаў, прадстаўленых у музеі. Таму ў 2012 годдзе прайшла рэарганізацыя экспазіцыі (малюнак 3).

Матэрыялы, дакументы, кнігі былі сфатаграфаваныя на электронныя носьбіты. Затым з гэтых малюнкаў былі створаны своеасаблівыя экспазіцыйныя плакаты. Усяго іх сямнаццаць, кожны з якіх прысвечаны асобнай тэме. Усе яны падсвечваюцца знутры.

З абноўленай ў 2012-м экспазіцыі можна даведацца пра нараджэнне у 1882 годзе хлопчыка Янкі. Сям’я Луцэвічаў пражыла ў фальварку няпоўных тры гады, арандуючы зямлю ў Станіслава і Алімпіі Замбжыцкіх [4]. Дарэчы, нашчадкі тых шляхціцаў цяпер жывуць у суседніх Радашковічах, у Польшчы. Сын былых гаспадароў Вязынкі Юзаф Замбжыцкі актыўна дапамагаў Уладзіславе Францаўне ў адкрыцці музея. Ён з задавальненнем расказваў, што ды як было ў панскай гаспадарцы, а сцяжынкі, па якіх Луцэвічы хадзілі, пасыпаў жвірам, абкладваў каменьчыкамі. Цяпер музей у Вязынцы — гэта тыповая хата канца XIX стагоддзя. У экспазіцыі ёсць калыска, у якой матуля, Бянігна Іванаўна, люляла свайго Янку, хадункі...

Кожны экспазіцыйны комплекс суправаджаецца паэтычнымі радкамі Янкі Купалы і фрагментамі яго аўтабіяграфічных лістоў.

У экспазіцыі выкарыстаны алічбаваныя матэрыялы: рукапісы Янкі Купалы і фатаграфіі з фондаў Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы; копіі дакументаў з Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі. Наведаўшы другую палову дома, у якой калісьці жыў брат Янкі Купалы Міхаіл, можна ўбачыць гісторыка-літаратурную экспазіцыю пра дзяцінства і юнацтва будучага вялікага паэта. Тут захоўваюцца аўтабіяграфічныя матэрыялы, кнігі, рукапісы, фатаграфіі і нават радавод сям'і Луцэвічаў да XVII стагоддзя, якая была адноўлена Ануфрыем - дзедам паэта. Акрамя таго тут можна ўбачыць герб роду Луцэвічаў - «Навіна».

У пакоі, дзе ў 1881–1883 гг. жыла сям’я Луцэвічаў, і ў сенцах узноўлены тагачасны інтэр’ер.

Атмасферу даўняга побыту ствараюць аўтэнтычныя рэчы канца XIX – пачатку XX стагоддзя, сабраныя ў ваколіцах Вязынкі.

У будынку свірана, рэканструяванага ў 1992 г., дзейнічае сезонная экспазіцыя “Народныя святы ў творчасці Янкі Купалы” [1] (малюнак 4).

Цяпер на тэрыторыі запаведніка да дня нараджэння народнага паэта Беларусі праводзяцца Рэспубліканскія святы паэзіі, песні і народных рамёстваў, традыцыйныя злёты студэнтаў-філолагаў БДУ,фінальныя канцэрты конкурсу аўтарскай песні “Купалаўскія вакацыі”, а таксама каляндарныя народныя святы.

На тэрыторыі запаведніка знаходзяцца рэчка Вязынка, якая дала назву мясцовасці, рэшткі былога маёнтка Замбжыцкіх: дом хатковых, свіран, хатка дваровых, стаў, стары сад, – а таксама гарадзішча культуры штрыхаванай керамікі II–IV стст. н. э., валуны з высечанымі на іх радкамі з твораў Янкі Купалы, крыніца, дуброва, пасаджаная беларускімі пісьменнікамі да 100-годдзя з дня нараджэння паэта, помнік паэту (скульптар З. Азгур)(дадатак 2), малыя архітэктурныя формы, узгорыстыя і лясістыя ваколіцы, якія з’яўляюцца прыроднай экспазіцыяй гісторыка-культурнага ландшафту, што адыгрывае вялікую ролю ў творах Песняра.

**Прыпынак 3.  Акопы**

Лагойшчына

Лагойшчына — радзіма вядомых беларускіх пісьменнікаў і паэтаў: Змітрака Бядулі, Ядзвігіна Ш. (А.Лявіцкі), Леапольда Радзевіча, Ніла Гілевіча, Івана Пташнікава і інш. На Лагойскай зямлі вырас і сфармаваўся вялікі нацыянальны паэт не толькі беларускай зямлі, але і ўсяго славянскага свету — Янка Купала [2].

Лагойскі раён створаны 17 ліпеня 1924 года. Тэрыторыя раёна складае 2,4 тысяч кв. км. Цэнтр раёна размешчаны на рацэ Гайна. Лагойск атрымаў статус горада ў 1998 годзе. У раёне 319 населеных пунктаў, у тым ліку і г. Лагойск, г.п. Плешчаніцы. Насельніцтва раёна складае каля 40 тыс. чалавек.

Цікавая геаграфічная адметнасць Лагойскага раёна: па яго тэрыторыі праходзіць вадападзел Балтыйскага і Чорнага мора.

Раён размешчаны на поўначы Мінскай вобласці, працягласць з поўначы на поўдзень — 90 км, з захаду на ўсход — 80 км. Раён мяжуе на поўначы з Докшыцкім раёнам Віцебскай вобласці, на паўднёвым усходзе — з Мінскім і Смалявіцкім раёнамі, на ўсходзе з Барысаўскім раёнам, на захадзе з Вілейскім.

Акопы

Філіял "Акопы" адкрыты для наведвання ў 1992 годзе ў гонар 110-й гадавіны з дня нараджэння паэта.

Менавіта ў Акопах Янка Купала нарадзіўся як лірык сусветнага значэння і выдатны драматург. Больш за 80 твораў Песняра маюць пазначэнне "Акопы" [1].

Тут з 1911 г. па 1926 г. з'явіліся паэмы "Бандароўна", "Яна і я", "Магіла льва", "Гарыслава" (незавершаная), усе драматычныя творы, вершы філасофскага, грамадзянскага, пейзажнага гучання, празаічны пераклад "Слова аб палку Ігаравым" і інш.

Філіял "Акопы" складаецца з дзвюх частак: мемарыяльнай (на месцы колішняга фальварка Акопы, які з 1909 г. арандавала маці паэта Б.І.Луцэвіч і які пасля 1917 г. перайшоў да яе ва ўласнасць) і літаратурна-дакументальнай (на месцы колішняга хутара Міхалішкі, які згадваецца ў "Паўлінцы" (цяпер – вёска Харужанцы).

У 1991 г. у вёсцы Харужанцы быў узведзены драўляны будынак, дзе ў 5 залах размясцілася літаратурна-дакументальная экспазіцыя, якая знаёміць наведвальнікаў з лагойскім перыядам жыцця і творчасці Янкі Купалы і раскрывае значэнне Купалавых шэдэўраў для будучых пакаленняў.

Экспазіцыя філіяла размешчана ў пяці залах, якія сваімі матэрыяламі дазваляюць вярнуцца ў пачатак XX стагоддзя (1910-1926 гг.), у перыяд найбольшага творчага ўздыму паэта. Асаблівасць экспазіцыі - гэта наяўнасць тэатральнай залы, бо менавіта ў Акопах раскрыўся талент Купалы-драматурга. Ля ўвахода ў будынак філіяла А.Заспіцкім і Г.Мурамцавым створана скульптурная кампазіцыя "Малады Купала» (дадатак 10) . У філіяле "Акопы» экспазіцыя адлюстроўвае найбольш актыўную творчую дзейнасць Янкі Купалы. Менавіта ў перыяд з 1909 па 1913 і далей па 1926 год ён напісаў свае найбольш выдатныя творы: паэмы "Бандароўна", "Яна і я", "Магіла льва", "Гарыслава", усе драматычныя творы, больш за сотню вершаў і г.д. У гэты перыяд Янка Купала праявіў сябе як лірык, філосаф, аналітык. Для перадачы атмасферы часу мастакі-стваральнікі экспазіцыі шырока выкарыстоўвалі этнаграфічныя прадметы. Мастацкія творы, фотаматэрыялы, рукапісы, друкаваныя выданні перадаюць найбольш плённы перыяд у творчасці Янкі Купалы (дадатак 11).

Мемарыяльная частка філіяла «Акопы» - гэта адноўленыя межы былой сядзібы Акопы, якую ўзяла ў арэнду маці Янкі Купалы Б.У.Луцэвіч ў 1909 годзе. На вялікі жаль, там, практычна, нічога не захавалася. Але зараз адноўлены падмуркі былога дома канца XIX стагоддзя і гаспадарчых пабудоў. У філіяле "Акопы" ў маі раз у два гады праводзяцца семінары-злёты для маладых паэтаў Міншчыны, ладзяцца фінальныя канцэрты конкурсу.

Каля будынка бруіцца крынічка, а побач узведзены крыж у памяць аб былой сядзібе Міхалішкі (дадатак 12).

За невялікім гаем, на паляне, размешчаны летні амфітэатр.

**Прыпынак 4. Радашковічы.**

Радашковічы- адзін з цэнтраў беларускага Адраджэння. У розны час тут вучыліся, жылі і працавалі знакамітыя пісьменнікі, мастакі, навукоўцы. Магчыма, паспрыяла гэтаму ўдалае размяшчэнне мястэчка, дзе перасякаліся шляхі з Украіны ў Прыбалтыку, з Расійскай дзяржавы ў Польшчу. А можа, зорак прываблівала яркая і цікавая назва месца? Адны кажуць, што ўтворана яна ад слоў радзіцца-раіцца, другія — ад радавацца. А трэція ўпэўнены, што паходзіць назва ад прозвішчаў Радашковіч, Радашкевіч. Тут пакінулі сляды знакамітыя людзі: Максім Танк, Язэп Драздовіч, Браніслаў Тарашкевіч… Нельга тут не сказаць і пра Янку Купалу.У 1882 годзе ў Свята-Траецкім касцёле, помніку класіцызму, быў ахрышчаны Янка Купала - класік беларускай літаратуры, паэт, драматург і публіцыст(дадатак 13). З Радашковіцкай зямлёй Івана Луцэвіча лёс зводзіў і пазней. У 1903 годзе, пасля смерці бацькі, ён уладкаваўся пісарам да мясцовага следчага. А праз дзесяць год у прысутнасці аўтара тут была пастаўлена знакамітая "Паўлінка". Дарэчы, будынак пажарнай каманды, дзе адбылася падзея, захаваўся, стаіць на мясцовым узвышшы. Цяжка узысці на яго: надта круты пад'ём. Узгорыстая мясцовасць разам са шматлікімі рэчкамі (тут зліваюцца Вязынка і Гуйка, з 1975 года працуе Вілейска-Мінская водная сістэма) — адметнасць Радашковічаў.

Мясцовыя жыхары не забываюць пра сваё зямляцтва з Купалам. Яго імем названа адна з вуліц, каля Цэнтра культуры і адпачынку пастаўлены бюст песняра.

**Мінск**

**Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы**

Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы — літаратурны і мемарыяльны музей, прысвечаны жыццю і творчасці класіка беларускай літаратуры, народнага паэта БССР Янкі Купалы. Заснаваны з 1944 годзе. Адкрыты для наведвальнікаў 20 верасня 1945 года. Музей знаходзіцца ў Мінску па вул. Янкі Купалы 4, на месцы былога дома паэта(дадатак 14).

**Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы**

Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы заснаваны ў верасні 1920 года намаганнямі першага мастацкага кіраўніка Фларыяна Ждановіча. Тэатр на працягу многіх гадоў паспяхова захоўвае найлепшыя дасягненні айчыннага тэатральнага мастацтва, а таксама спалучае традыцыйныя каштоўнасці з устаноўкай на няспынны мастацкі пошук і творчы эксперымент. Рэпертуар тэатра налічвае каля 25 пастановак розных жанраў і форм паводле п’ес айчынных класікаў, а таксама сучасных аўтараў, дзеля чаго актыўна супрацоўнічае з найлепшымі драматургамі, мастакамі і рэжысёрамі(дадатак 15).

У багатым рэпертуары Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы спектакль “Паўлінка” заўсёды стаіць асобна. Найстарэйшы спектакль тэатра карыстаецца вялікай любоўю гледачоў і за доўгія гады свайго існавання ператварыўся ў сапраўдную візітоўку, сімвал Купалаўскай сцэны. І менавіта гэтай пастаноўкай у Купалаўскім тэатры штогод адкрываецца новы сезон. Звычайную гісторыю пра тое, як дзяўчына абрала сабе жаніха насуперак бацькоўскай волі, народны паэт Беларусі Янка Купала шчодра аздобіў нацыянальным каларытам і сакавітым народным гумарам.

**Заключэнне.**

З кожным годам літаратурныя экскурсіі займаюць усё большае месца ў пазакласнай рабоце з вучнямі. Ужо не патрабуе асаблівых доказаў тое, што на самых розных этапах вучэбнага і выхаваўчага працэсаў выкарыстанне экскурсійнага матэрыялу адыгрывае важную ролю як у пазнавальным, так і ў выхаваўчым стаўленні. Найбольш эфектыўнымі з'яўляюцца тыя экскурсіі, якія звязаны з біяграфіяй пісьменніка, бо яны даюць новы матэрыял, стымулююць цікавасць да жыцця і творчасці таго ці іншага аўтара.

Творы Янкі Купалы становяцца больш зразумелымі і выклікаюць асаблівую цікавасць вучняў пасля наведвання імі месцаў жыцця і творчасці паэта. Экскурсія не толькі развівае эстэтычную культуру, вучыць разумець прыгожае, але і дапамагае выконваць галоўную задачу школы – прывіваць любоў да роднай зямлі, далучаць вучняў да літаратуры праз знаёмства з родным краем і яе выдатнымі людзьмі.

**Літаратура**

1. Багдановіч І., Саламевіч І. Купалазнаўства // Беларуская энцыклапедыя. У 18 т. Т. 9. Мінск:, 1999. С. 28-29.

2. Багдановіч І., Дапкюнас Ж. Купала Янка // Беларускія пісьменнікі: Біябібліягр. слоўн. У 6 т. Т. 3 / Ін-т літ. імя Я. Купалы АН Рэспублікі Беларусь, Беларус. Энцыкл.; Пад рэд. А.В. Мальдзіса. Мінск, 1994. С. 489-494

3. Васючэнка П. Драматургічная спадчына Янкі Купалы. Мінск, 1994.

4. Гніламёдаў У. Янка Купала. Мінск, 1995.

**Дадатак 1**



*Вязынка*

**Дадатак 2**




*Вязынка. Помнік паэту*

**Дадатак 3**



*Экспазіцыя філіяла “Вязынка”*




**Дадатак 4**

*Купалаўскі запаведнік “Вязынка”*

***Дадатак 5***




*Мемарыяльная дошка*

**Дадатак 6**



*Будынк вінакурні*



**Дадатак 7**

*Яхімоўшчына. Будынак колішняй канторы бровара пана Любанскага*

**Дадатак 8**



*Экспазіцыя філіяла “Яхімоўшчына”*

**Дадатак 9**



*Экспазіцыя філіяла “Яхімоўшчына”*

**Дадатак 10**



*Помнік Янку Купалу*

**Дадатак 11**



*Літаратурна -дакументальная экспазіцыя філіяла “Акопы”*

**Дадатак 12**



*Крынічка, крыж у памяць аб былой сядзібе Міхалішкі*

**Дадатак 13**



*Касцёл Святой Троіцы, у якім хрысцілі Янку*

**Дадатак 14**



*Музей Янкі Купалы ў Мінску*

**Дадатак 15**

